ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ

ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА І МЕНСКАГА КОМІТЭТАЎ ЛЕНІНСКАГА КОМУНІСТЫЧНАГА САЮЗУ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ

№ 68 (450) Серада 22 чэрвеня 1927 г. | Выходзіць тры разы на тыдню у СЕРАДУ, ПЯТНІЦУ І НЯДЗЕЛЮ | Год выд. VII. | Рэдактар прымае ад 12 да 2 гадз. дню. Сакратар ад 10—12 і ад 2—3 гадз. Тэл. № 903. | Адрас рэдакцыі газэты „Чырвоная Зьмена": Менск, Комзам. 25.

Да ведама ўсіх сяброў ЛКСМБ

АПА ЦК ЛКСМБ даводзіць да ведама ўсіх сяброў ЛКСМБ аб паступленьні ў продаж кнігі «Нарысы па гісторыі комсамолу Беларусі". АПА ЦК ЛКСМБ настойліва раіць кожнаму комсамольцу набыць гэтую кніжку, якая дасьць магчымасьць вывучыць гісторыю рэволюцыйнага юнацкага руху Беларусі, зараджэньне і разьвіцьцё ЛКСМБ.

АПА ЦК ЛКСМБ.

Пераможам настойлівасьцю!

Балоты ў Беларусі займаюць агромністыя прасторы.

Сотні, тысячы дзесяцін знаходзяцца пад цэпкай, адвечнай уладаю балот.

Асушка балот, стварэньне мэліорацыйных таварыстваў і ўдзел у іх зьяўляецца аднэй з галоўных гаспадарчых задач у вёсцы.

Цэпкую ўладу балот трэба перамагчы маладой, бадзёрай сілай мэліорацыйных таварыстваў.

Барацьба з балотамі—гэта асобны ваенны фронт, дзе замест вінтовак—рыдлёўкі, замест акопаў—канавы, а замест захопленых тэрыторый—адваяваньне новых дзялянак зямлі.

І ў гэтай барацьбе, гэтай „вайне" перадавым, галоўным атрадам—павінны быць вясковыя комсамольскія ячэйкі.

Гэта пачэсная, але і ЦЯЖКАЯ задача.

Нам трэба выхаваць комсамольцаў-энтузыястых, практычных барацьбітоў за мэліорацыю, трэба зрабіць мэліорацыю сьцягам гаспадарчай працы ў беларускай вёсцы.

Комсамольская ячэйка, паасобныя комсамольцы павінны зьявіцца ДРОЖДЖАМІ для стварэньня мэліорацыйных таварыстваў.

Нам пара практычна ажыцьцёвіць пажаданьне ЦК УсеЛКСМ аб прыняцьці асобнымі раённымі комсамольскімі організацыямі ШЭФСТВА НАД МЭЛІОРАЦЫЙНЫМІ ТАВАРЫСТВАМІ РАЁНУ.

На старонках газэты „Чырвоная Зьмена" пачынае друкавацца матар'ял—вопыт асобных мэліорацыйных таварыстваў. Гэтым вопытам павінны карыстацца ў сваёй практычнай працы ўсе вясковыя комсамольскія ячэйкі.

Друкуемыя сёньня корэспонданцыі аб посьпехах, аб радасных дасягненьнях скурацкіх комсамольцаў—вось лепшая „дырэктыва", лепшы „цыркуляр", як трэба ўдзельнічаць ў мэліорацыйных таварыствах.

Мы заклікаем вясковыя ячэйкі аддаць многа ўвагі і сіл гэтай, вельмі важнай частцы, гаспадарчай працы.

Асобныя прыклады не павінны зьявіцца толькі пэршай ластаўкай не прадвяшчаючай вясны.

Скураты—гэта адзін з тых «прызыўных агнёў», якія ўсё чашчэй і чашчэй павінны мільгаць на карце Беларусі.

Цэпкую, векавую ўладу балот мы пераможам нашай організаванасьцю і найстойлівасьцю.

Увага асушцы балот!

ТАВАРЫСКАЯ ПАДЗЯКА.

ЛІСТ САКРАТАРУ ЛЕНІНГРАДЗКАГА ГУБКОМУ УСЕ ЛКСМ ТАВ. СОБАЛЕВУ І РЭДАКТАРУ ГАЗЭТЫ „СМЕНА" ТАВ. ЛІХАВУ.

Сто дваццаць маладых рабочых і сялян Беларусі, выяжджаючы з гораду Леніна, разам з незабываемым уражаньнем аб дзесяці днёх праведзеных у Ленінградзе—павезьлі з сабою і адчуваньне вялікай, сардэчнай падзякі маладым рабочым Ленінграду, іх галоўнаму атраду—комсамолу за шчырае, цёплае спатканьне, за братэрскі прыём.

Апавяданьні аб жыцьці і працоўных буднях Ленінградзкай комсамольскай організацыі, пераплятаючыся з весткай аб гэтым спатканьні, разьнясуцца ва ўсе куткі Беларусі, будуць служыць настойлівым заклікам да яшчэ большага ўзмацненьня працы комсамольскай організацыі БССР, да раўненьня на цэнтр савецкай індустрыі—горад Ленінград.

Ленінградзкі губком УсеЛКСМ і рэдакцыя яго газэты «Смена» зрабілі ўсё магчымае для найбольш лепшай падрыхтоўкі і правядзеньня экскурсіі.

Цэнтральны Камітэт Комсамолу Беларусі і рэдакцыя газэты „Чырвоная Зьмена" ад свайго імя, а таксама па даручэньню ўсіх удзельнікаў першай усебеларускай экскурсіі працоўнай моладзі выказваюць вялікую таварыскую падзяку Ленінградзкаму губкому УсеЛКСМ і рэдакцыі газэты „Смена".

Мы асабліва адзначаем мерапрыемства газэты „Смена" прысьвяціўшай цэлую старонку газэты апісаньню працы комсамолу Беларусі.

З вялікай радасьцю комсамольская організацыя Бел. спаткала паведамленьне аб падрыхтоўцы адказнай экскурсіі маладых Ленінградзкіх пролетарыяў.

З нецярпеньнем чакаем жаданых, дарагіх гасьцей!


З таварыскім прывітаньнем:

Сэкратар Цэнтральнага Камітэту Комсамолу Беларусі
А. БАРАНЬНІКАЎ.

Адказны рэдактар газэты „Чырвоная Зьмена" А. КУРЦІК.

Менск, чэрвень 1927 г.

„Эксплёататарам—вяроўка, прыгонцам—сьмерць".



Ханькоўскія рабочыя паслалі к зьезду чырвоных франтавікоў у Бэрліне сьцяг з наступнымі надпісамі: „Прысьвячаецца III зьезду чырвоных франтавікоў Нямеччыны. Ад Ханькоўскіх рабочых нямецкім братом". „Эксплёататарам—вяроўка, прыгонцам сьмерць". „Сялянам--зямля, рабочым—свабода". „Няхай жыве ўлада рабочых і сялян".



„Без мяне--мяне ажанілі"

(Талочын, Аршанскай акругі)

Калі комсамолец Каган С., старшыня Талочынскага мясцкому профсаюзу скурнікаў сядзеў у сваім пакоі і працаваў, два сябры бюро Талочынскага РК ЛКСМБ таксама «працавалі»... Яны зачынілі дзьверы таго пакою, у якім сядзеў за працай тав. Каган, і больш двух гадзін ня далі адтуль выйсьці.

Каган падаў у райком заяву на абодвых «малодчыкаў». Вось тут-та і пачынаецца гісторыя. Заява была пададзена яшчэ ў красавіку месяцы. Праходзіць тыдзень, Каган зьяўляецца ў райком за атрыманьнем даведкі аб выніках яго заявы.

-- Яшчэ не разглядалі,--адказваюць яму ў райкоме.

Праходзіць яшчэ тыдзень. Каган прыходзіць на пасяджэньне бюро райкому дзеля падрабязнага высьвятленьня пытаньня аб заяве.

— Хто цябе сюды клікаў?—пытае ў яго сэкратар райкому. Калі патрабуецца, дык выклікаем цябе.

За другім прашоў трэці, чацьвёрты тыдзень... Ужо два месяцы. А аб заяве ўсё «ні слуху, ні духу». Тады Каган адважыўся задаць аб гэтым пытаньне сэкратару райкому на агульна-гарадзкім сходзе комсамольцаў.

— А ці ўсякі комсамолец павінен ведаць, што зрабіў райком з яго заявай—у адказ на гэта пытае сэкратар райкомолу. Па думцы Талочынскага райкому—не.

Вядома, не! Можна ажаніць хлапца і без яго ведама,—думаюць талочынскія райкомаўцы. Як-жа гэта радавы комсамолец Каган будзе ведаць такія сакрэты як... рашэньне райкому па яго заяве?

А Каган гэтым цікавіцца. Ён хоча, каб па яго, хай сабе дробязнай заяве, райком даў-бы яму належны адказ. Гэтага патрабуюць усе радавыя комсамольцы ад саюзнага актыву.

М. Зак.

„Парыскія моды"

Насьценная газэта, якая павінна была адбіваць жыцьцёДзяржгандльбелу, не прашла і міма факта, які вельмі абурыў розум некаторых супрацоўнікаў.,. міма факту абсьледваньня РСІ, пасьля якога штат Белкантору Дзяржгандльбелу быў скарочан на 50 проц.

Настрой гэтых супрацоўнікаў выказаў аўтар артыкулу «Аб модах і рацыяналізацыі». Артыкул пачынаецца з вельмі «вумных» разважаньняў аб модах у Парыжы, дзе займаюцца перакладваньнем мадэляў з аднаго сундука ў другі, і калі адзін апарожніваецца, зноў пачынаюць перакладваць мадэлі ў першы сундук.

Адным словам, у артыкуле «Аб модах і рацыяналізацыі» малюецца праца РСІ як «пераліваньне з пустога ў парожняе».

Але апісваючы працу РСІ аўтар запамятаў пра адну маленькую дэталь, што ў выніку абсьледваньня РСІ, апарат Дзяржгандльбелу значна ўпрошчан, скарочаны каля 60 адзінак, дадзен шэраг паказаньняў у працы. Аб гэтым ён ня піша.

Аб гэтым патрэбна было памятаць рэдакцыі насьценгазэты

Р. Г--н.

4 месяцы выплачваюць

Каржанеўскі Мікола дэмобілізаваўшыся з Чырвонай Арміі паступіў працаваць у Нарсуд 3-га вучастку Менскай акругі.

Прапрацаваўшы вызначаны тэрмін, Каржанеўскі павінен быў атрымаць 41 р. 50 к.

Але бюрократ, каб ён без усялякіх клапот выплаціў патрэбныя грошы, — ня быў-бы бюрократам і, як відаецца, грошы Каржанеўскаму ня былі выдадзены.

Ляціць заява ў бюро скаргаў РСІ. Адтуль—запрос у сэкратарыят Менскага акрвыканкому. Менскі акрвыканком накіраваў ужо пачынаўшую таўсьцець перапіску ў акруговы суд, аб чым і паведаміў бюро скаргаў.

Прайшло 3 месяцы і бюро скаргаў у канцы сакавіка месяцу шле запрос ў Менскі акруговы суд. Нарэшце, 18-га красавіка атрыман адказ, што справа Каржанеўскага ўжо разабрана і хадайнічаньне яго аб выплаце 41 р. 50 к. задаволена. Грошы будуць яму высланы праз Слуцкі акрвыканком у маі месяцы.

Памалу пасьля гэтага цацяклі дні. Бюро скаргаў занялося ўжо вырашэньнем шматлікавых другіх спраў. Пра Каржанеўскага ўжо забыліся. А 17-га чэрвеня ён даў зноў аб сабе знаць. Ён піша, што ніякіх грошаў не атрымоўваў.



Ня відаць дарогі!

Агляд за тыдзень

Жыцьцё Савецкага Саюзу

Апошнія падзеі (замах на Войкава, забойства Апанскага, выбух у Ленінградзе і г. д.) кажуць, што нашы ворагі мяркуюць стварыць у нас паніку, нэрвознасьць, няўпэўненасьць у тым, што будаўнічыя праграмы будуць закончаны. Гэткі настрой у нас ім патрэбен для таго, каб не даць расьці Савецкаму Саюзу, а таксама даказаць працоўным усяго сьвету, што пролетарыят СССР уласна, бяз сіл буржуазіі ня можа будаваць сваю гаспадарку.

Мова лічб

Ці пасягнулі яны гэтымі замахамі сваёй мэты? Плян разьвіцьця народнай гаспадаркі СССР на пяцігодзьдзе (1926-27—1930-31 г.) прадугледжвае прырост валавой прадукцыі ўсёй прамысловасьці СССР на 70,5 проц., у тым ліку дзяржаўная павялічыцца на 79 проц., коопэрацыйная на 65 проц. і прыватная на 30 проц. Асабліва рэальным тэмп росту будзе па буйной дзяржаўнай прамысловасьці, якая ў 1925-26 г. вырабляла на 5318 міліёнаў рублёў, у 1926-27 г. вырабляла на 6327 міл. рублёў, а ў 1930-31 г. яна павялічыцца да 9518 міліёнаў рублёў.

На капітальнае будаўніцтва за гэтыя 5 гадоў будзе патрачана 5.653.600.000 рублёў.

Прыведзеныя лічбы сьведчаць аб тым вялізным размаху будаўніцтва, якое мы распачалі. Менавіта па гэтай галіне нашай працы накіраваны зараз удары нашых ворагаў.

Наша Чырвоная армія--лепшы вартаўнік, якая будзе ахоўваць наш спакой, наша будаўніцтва. Але ўскласьці гэта ўсё выключна на Чырвоную армію нельга. Яшчэ раз, як і ў часы грамадзянскай вайны, працуючы каля варштату, будзем помніць аб ахове гэтага варштату, заводу і фабрыкі. Будзем правяраць ахову нашых прадпрыемстваў, гэтую ахову трэба павялічыць.

Праверым становішча нашых заводзкіх і гарадзкіх пажарных каманд, бо яны ва ўсякі момант павінны быць гатовы тушыць пажар, які можа выбухнуць на заводзе.

Чаму яшчэ нас вучаць гэтыя замахі?

Хто яны ўсе тыя, якія забілі Войкава і Апанскага, кідалі бомбы ў Ленінградзе, падпальвалі фабрыкі і заводы ў іншых гарадох нашага Саюзу?

Усе яны прысланы да нас з-за межаў узброеныя чужаземнымі бомбамі і кулямі, фінансаваныя ангельскай контр-разьведкай.

Ні адзін грамадзянін у СССР не падтрымаў гэтых шалёных падлянцоў, якія адважыліся замахнуцца на нашых політычных дзеячоў. Праз гэтых дзеячоў натхніцелі забойстваў цэліліся ў нашы фабрыкі і заводы, а праз іх да рабочых і сялянскіх мас.

Ніякага падтрыманьня ні ў адным горадзе і весцы яны не знайшлі, іх пляны сарваліся, а сымпатыі насельніцтва да ўлады і магутнасьць СССР яшчэ больш узраслі.

Нам ва ўмовах Савецкай Беларусі трэба асабліва памятаць, што Кавэрды і Паўлюкевічы, якія на словах гавораць аб «незалежнасьці» і самастойнасьці», фактычна працуюць для тых, хто гаворыць аб «адзінай і непадзельнай», хто хоча зноў беларускіх, украінскіх і іншых рабочых і сялян загнаць ў няволю, у гнёт.

Ні на водную хвіліну мы ня спынім справу соцыялістычнага будаўніцтва.

Англія хоча нас абкружыць экономічнай блёкадай, мы ў адказ на гэта ўзмацнім нашу фінансавую самаабарону.

За чатыры гады (1921-22—1925-26) намі распаўсюджана дзяржаўных пазык на суму звыш паўміліярду рублёў.

За гэты-ж час ужо больш чвэрці міліярду ўрадам пагашана--зьвернута назад. Зараз дзяржаўная запазычанасьць ўнутры краіны складае 375 міліёнаў, а разам з пазыкай дзяржаўнага аднаўленьня складае 617 міліёнаў. Гэтыя лічбы нас задаволіць ня могуць. Нам трэба іх павялічыць хоць ў два разы ў працягу бліжэйшага паўгоду. Тульскі губпрафсавет ад імя тульскага пролетарыту зьвярнуўся да ўраду выпусьціць новую ўнутраную пазыку ў адказ на «разрыў Чэмбэрлена». БССР павінна цалкам падтрымаць гэтае хадайніцтва перад урадам. Разгорнем вялізарную фінансавую самаабарону і тады нам ніякі вораг страшны ня будзе.

Комсамольцы шэфы над Чырвоным Флётам! Флёту зараз у сто раз больш увагі. Усе нашы клопаты Чырвонай Арміі.

Мы маем гаткую вялізарную сілу, якой ня мае ні адна дзяржава ва ўсім сьвеце—гэта наша моцная і непарыўная сувязь з Чырвонай Арміяй і Флётам. У той час, калі ў капіталістычных краінах паміж арміяй і працоўнымі масамі вялізарны разрыў, у нас у СССР гэтыя абедзьве сілы непарыўны, шчыльна згуртаваны, аб'яднаны. Гэтыя сілы нікога не спалохаюцца, нікому ня ўступяць.

Будзем памятаць аб абароне.

Л. Каплан.

Як абыйсьціся бяз ласкі Чэмбэрлена?

НА ГЭТА АДКАЗВАЕ СТАРЫ РАБОЧЫ:

„...Яшчэ некалькі сот такіх добрых майстраў і мы абойдземся бяз ласкі Чэмбэрлена“.

Ці ёсьць вучнёўства у шкляной прамысловасьці?

(У парадку абгаварэньня).

Пагляды працаўнікоў комсамолу з аднаго боку, профэсыянальных і гаспадарчых організацый—з другога, па пытаньню аб вучнёўстве ў шкляной прамысловасьці—прама працілеглы.

— Першыя кажуць, што вучнёўства адсутнічае, а другія пацьвярджаюць, што яно ёсьць.

Я лічу неабходным прыцягнуць да абгавору гэтага пытаньня ўсю рабочую моладзь шкляных заводаў.

Мае пагляды па гэтаму пытаньню наступныя:

— У шкляной прамысловасьці ня было, няма і ня будзе зьверхштатнай броні, а ўсе падросткі працуюць і вучацца на штатных мясцох.

Зьверхштатнай броні ня можа быць, таму, што ванная печ—адзіна- вытворчая частка заводу—мае ад 5-ці да 10-ці вакон-варштатаў (на языку рабочых—станок); гэта значыць, што ўся продукцыя выпускаецца 5—10-ю станкамі.

Калі пасьля гэтага, дапусьціць зьверхштатную бронь, а для яе абучэньня ўзяць хоць-бы адзін станок, то гэтым мы зразу скароцім вытворчасьць на 10—20 проц

Адкінем гэты «гаспадарчы» ўхіл і паглядзімо—каго мы зможам абучыць, калі на кожным заводзе будзе па аднаму станку.

Абучаючы пры станку-варштату адзіначасовую групу вучняў, роўную комплекту рабочага варштату (5 чал.), па 6 гадзін, нават круглыя суткі, мы абхопім усяго 20 чал., што дасьць, замест маючыхся па шкляной прамысловасьці 12 проц. толькі 4 проц. (лічачы, што сярэдні лік рабочых шклянога заводу—500 чал.).

Адгэтуль ясна, што зьверхштатнага брыгаднага вучнёўства на

-- Зьверхштатнае індывідуальнае вучнёўства зусім не магчыма вось чаму: кожны варштат мае вядомы комплект рабочых, з якіх кожны выконвае вядомую спэцыяльнасьць. Калі паставіць к варштату вучня, тады трэба зьняць штатнага рабочага і ў выніку--штатны рабочы стане зьверхштатным, а зьверхштатны вучань--штатным.

-- Застаецца перагледзець апошні від вучнёўства--школу ФЗВ.

Калі дабіцца ідэальнай мэты--адчыніць у БССР адну такую школу, то ёю можна будзе абхапіць максімум 30 чал., альбо 1 проц. броні (рабочых на ўсіх заводах 3000 чал.). Саюз хэмікаў абязаў шкляны трэст па колектыўнай умове адчыніць у гэтым годзе школу ФЗВ, але дзе-ж будзе абучацца астатняя моладзь?

Адгэтуль вынікае, што шкляная прамысловасьць патрабуе асобнага роду вучнёўства. І гэтае вучнёўства ёсьць. Гэта--штатнае вучнёўства. Аб гэтым комсамольскія працаўнікі забываюць.

Штатнае вучнёўства выяўляецца ў тым, што падросткі--бранявікі, працуючы, як і дарослыя рабочыя, на штатных пасадах, прымацоўваюцца да майстроў для абучэньня, а майстры за гэта атрымоўваюць вядомую компэнсацыю.

На колектыўнай умове шкляны трэст абязаўся адчыніць па 3-х заводах масавыя вячэрнія тэхнічныя курсы, задача якіх--даць моладзі тэорэтычную падрыхтоўку.

Такім чынам, штатнае вучнёўства на вытворчасьці і тэхнічныя курсы для тэорытычнай падрыхтоўкі-- самы эканомны, практычны і масавы від вучнёўства для шкляной прамысловасьці.

Такое вучнёўства і праводзіцца. Ёсьць недахопы, але нельга казаць, што яго— [illegible]

І. Ш.

Вечар „майстра і вучня“

(Завод „Энэргія“, Менск)

Усяго вучняў на заводзе 26 чалавек. Насьпяваемасьць хлапцоў добрая і перавод з разраду ў разрад забясьпечан поўнасьцю. Дрэнна толькі, што да гэтага часу наглядаліся выпадкі зьдзельнай працы вучняў 2-га і 3-га разраду.

Зараз будзе ўтворана камісія па вучнёўству, у склад якой увойдуць: прадстаўнік ад заводакіраўніцтва, 2 майстры, абучаючыя вучняў, і прадстаўнік моладзі ў заўкоме.

Намечан, таксама, вечар «майстра і вучня», на якім будуць організаваны сарэўнаваньні вучняў па выкананьню розных вытворчых процэсаў і ўшанаваньне лепшых майстраў і вучняў.

У. С.

На выстаўцы

(Прафшкола Зах. чыг. Менск)

Кожны год прафшкола Зах. чыгунак організоўвае выстаўку сваіх прац.

Ня гледзячы на тое, што ў гэтым годзе на выстаўцы паказаны працы вучняў толькі 1-ае і 2-ое клясы, яна зьяўляецца надта цікавай.

Увесь першы пакой заняты чарцяжамі, малюнакмі і схэмамі розных машын і іх частак.

— Далей паказана самастойная праца вучняў: малаткі, ціскі, ключы і г. д. — усё гэта зроблена так зграбна і ўмела, што здаецца нібы гэта праца рук здольнага майстра.

Тут-жа кідаецца ў вочы праца дзяўчат. Людзі, якія разглядалі гэтыя працы, ніколі-б, каб не надпісы, не паверылі таму, што гэта справы дзявочых рук.

Выстаўка надта цікавая—на ей ёсьць усё, што патрэбна на транспарце. Нядарам каля 1000 чалавек рабочых [illegible] выстаўку, далі найлепшыя водгукі аб школе і настаўніках. Вось адзін з такіх водгукаў:

— «Яшчэ год, два, яшчэ некалькі сот такіх добрых майстраў і мы абойдземся бяз ласкі «Чэмбэрлена».

—Ён сказаў праўду.

Блакітны.

ФІЗКУЛЬТУРА

Пабудуем спортыўныя пляцоўкі

Лепшым месцам для фізкультурнай працы ўлетку—спортпляцоўка

Цэнтральным месцам працы гуртка фізкультуры павінна быць спортыўная пляцоўка. Вясковая спортыўная пляцоўка павінна зьяўляцца месцам правядзеньня ўсёй масавай работы па фізкультуры —гульні, фізычныя практыкаваньні і г. д. —і месцам прапаганды фізкультуры, дзе займаецца вясковая моладзь і дарослае насельніцтва.

Задача вясковага гуртка заключаецца ў тым, каб правільна організаваць працу на спортпляцоўцы: увесьці парадак, дысцыпліну, строгае разьмеркаваньне заняткаў, ачыстка пляцоўкі і. г. д.

Чым больш будзе парадку і організаванасьці ў рабоце, чым жывей і рознавыглядней будуць праводзіцца заняткі, фізычнымі практыкаваньнямі і гульнямі, тым хутчэй можна прыцягнуць вясковую моладзь на пляцоўку. На пляцоўцы трэба праводзіць вядомыя і распаўсюджаныя сярод сялянства народныя, бытавыя гульні, скокі, гледзячы за організаваным іх правядзеньнем.

Калі добра будзе пастаўлена праца, пляцоўка будзе знаходзіцца ў цэнтры вёскі (пажадана блізка каля хаты-чытальні ці школы), дык на яе пойдзе і дарослае насельніцтва.

Будаваць пляцоўку трэба на роўным сухім месцы, дзе няма пылу. Добра—на беразе рэчкі, каля лесу.

Мець спартыўныя прылады для спортпляцоўкі вельмі неабходна. Большасьць з гэтых прыладаў могуць зрабіць і самі фізкультурнікі. А для здабыцьця такіх рэчаў, як футбольны мяч, кольца, турнік, трэба прыцягнуць усю сялянскую моладзь, дарослых сялян, а, самае галоўнае, культурныя, грамадзкія і інш. організацыі вёскі: хата-чытальня, школа, коопэрацы... сельсавет.


Як выбраць месца для пляцоўкі

Трэба падшукаць роўную палянк... крокаў 150 даўжыні і 100 шырыні, ... крытую нявысокай травой. Лепш за ў... прыстасаваць для пляцоўкі сухадол, та... што з яго мала зьнімаюць травы і ... ня шкода таптаць.

Як разьмеркаваць пляцоўк...

Калі месца для пляцоўкі падшука... дык трэба разьмеркаваць яе, г. зн. ... значыць—дзе што будзе. Пажадана, ... на пляцоўцы можна было займацца лёгк... атлетыкай, футболам, баскетболам і і... шымі гульнямі. Значыць, нам трэба ме... на пляцоўцы: сьцежку для бега, мес... для скачкоў у даўжыню і вышыню, ме... для штурханьня ядра і месца для ... даньня дыску, кап'я і гранаты; 2) фу... больнае поле і 3) баскетбольную пл... цоўку. Усё гэта трэба разьмеркаваць та... каб адно другому не перашкаджала.

На нашым малюнку паказаны пр... кладны плян спортыўнай пляцоўкі.





„Дрэнны ты комсамолец, калі добра ладзіш з бацькамі“-- вось як кажуць некаторыя хлапцы

Як твая думка? Чакаем допісаў!

(Увесь матар'ял зьмяшчаецца ў парадку абгаварэньня)

Трэба зьвярнуць увагу

Ня гледзячы на шэраг важных пытаньняў выяўленых і высьветленых за апошнія часы комсамольскім друкам, яшчэ й да сёньняшняга дню не відаць было ні аднэй строчкі аб тым, ЯК ЖЫВУЦЬ КОМСАМОЛЬЦЫ ДОМА Ў СВАЁЙ СЯМ'І.

Пытаньне гэта надта важнае і на ім трэба застанавіцца, тым болей, што тут маецца шэраг крыватолкаў.

Многія рэбяты трымаюцца такой думкі, што калі хлапец, альбо дзяўчына, жывуць у сваёй сям'і (нават рабочай), то яны ня могуць быць добрымі комсамольцамі.

Многія комсамольцы, пачынаючы зарабляць грошы, пакідаюць сваіх бацькоў і шукаюць кватэры—„каб жыць самастойна“, але канец ад гэтага бывае часта надта дрэнны--ня ўмеючым правільна траціць свой месячны заробак, (апошняга хапае толькі на два тыдні), прыходзіцца хоць зубы класьці на паліцу.

Некаторыя-ж робяць яшчэ „лепш“—жывуць дома і „шамаюць“ дома, а заробку бацькам не даюць. Вось як скардзіўся друкар Фрыдман — бацька комсамольца—на свайго сына, які працуе ў профшколе друкароў:

—„Жыць з вялікай сям'ёю за маю пэнсію цяжка, а між тым, у мяне ёсьць сын, які ў месяц зарабляе 45 рублёў, а мне ні дае ні капейкі, у той час, калі ён есьць дома“.

Вось з-за чаго бацькі часам ня пускаюць сваіх дзяцей у Комсамол.

Такія адносіны комсамольцаў да сваіх бацькоў часткова затрымліваюць рост нашай організацыі за лік рабочай моладзі.

Такіх Фрыдманаў у Комсамоле ёсьць многа. Наша задача — растлумачыць ім як трэба весьці сябе з бацькамі.

Не мяшала-б правесьці нараду бацькоў комсамоцьцаў, на якой і абгаварыць гэтае пытаньне.

Трэба гэтыя пытаньні ставіць на сходах комсамольскіх ячэек і прабіраць асобных комсамольцаў, якія дрэнна вядуць сябе ў сям'і.

ГАРАВЫ.

Важнае, але забытае.

(У адказ на артыкул тав. Гаравога).

Я цалкам згаджаюся з думкамі тав. Гаравога і яшчэ раз падкрэсьліваю, што пытаньне гэта надзвычайна балючае. Вядома, няма ніякага сумленьня ў тым, што большая частка нашых комсамольцаў з сваімі бацькамі жыве добра—адны дапамагаюць у працы, другія матэрыяльна і г. д.

Але, разам з гэтым, яшчэ надта значны лік комсамольцаў (комсамолак менш) вядуць сябе так, што «хоць вочы закрывай, ды і ў лес уцякай».—Штодзённыя сваркі, лаянкі, нават з «матушкай», розныя пакасьці, шуканьне кватэры і г. д.

Трэба ўхапіцца.

Вядучы барацьбу за новы комуністычны быт, было-б вялікім злачынствам прапускаць гэта міма нашага комсамольскага вока, як гэта робіцца ў большасьці нашых ячэек. За гэтае пытаньне нам, асабліва «Чырвонай Зьмене», трэба ўхапіцца, высьвятліць на сваіх старонках, згуртаваць навакол яго шырокую грамадзкую думку. Інакш пустою балтаўнёю застануцца ўсе нашы размовы (а гэтага ў нас хапае) аб новым быце.

„Дрэнны ты комсамолец, калі добра ладзіш з бацькамі“.

Надта кідаюцца ў вочы такія зьявішчы: хлапец, альбо дзяўчына (часьцей з хлапцамі), будучы беспартыйнымі, з бацькамі жывуць добра, а як толькі ўвойдуць у шэрагі комсамолу—лічы прапала.

— Зараз-жа лаянка, шуканьне кватэры і многія іншыя «прелести» хатняга быту.

Такія зьявішчы выклікаюцца ў большасьці тымі думкамі комсамольцаў, аб якіх піша тав. Гаравы—«дрэнны ты комсамолец, калі добра ладзіш з бацькамі».

Другое—

адносіны комсамольцаў да сваіх малодшых братоў і сясьцёр.

— Мы ўцягваем дзяцей у піонэрскія атрады, мы прывіваем ім цэлы шэраг навыкаў і звычаяў—выхоўваем іх у комуністычным духу.

Давайце паглядзімо, як-жа выхоўваюць сваіх малодшых братоў і сясьцёр комсамольцы?

Адсутнасьць якой-бы та нібыло ўвагі да іх, а часта дрэнныя адносіны і розныя грубасьці, нават бойкі— вось як «зразумелі» некаторыя комсамольцы задачы падрыхтоўкі зьмены.

Дзеці, якім у атрадзе кажуць, што яны зьмена комсамолу, што комсамольцы іх старшыя браты і правадыры--гэтаму не павераць. Яны будуць бачыць тую пропасьць, якая існуе паміж словамі комсамольцаў і іх справамі. Гэтак можна загубіць усю справу выхаваньня дзяцей.

Можна-б было пісаць і аб іншых хваробах, якія сярод комсамольцаў у гэтым напрамку маюцца, але я спадзяюся, што аб іх напішуць другія таварышы.

Да чаго гэта можа прывесьці

Бацькі, маючыя такіх «прыкладных» дзяцей-комсамольцаў, «даводзяць да ведама» аб іх наступках сваім блізкім і знаёмым, а праз іх і ўсяму астатняму раёну.

Пасьля таго, як насельніцтва ўжо «інфарміравана» аб такіх «здольнасьцях» комсамольцаў, нечага чакаць добрых адносін бацькоў да паступленьня сваіх дзяцей у комсамол.

Яны іх ня пусьцяць, ды моладзь і сама ня пойдзе, а пойдзе той, хто потым будзе рабіць яшчэ горш.

Ня маючы аўторытэту сярод дарослых, якія не могуць спакойна глядзець на комсамольца, такая ячэйка праводзіць карысную працу ня зможа. Хірэць яна будзе таму, што яе мерапрыемстваў амаль ніхто ня будзе падтрымліваць.

Мае прапановы

Трэба стварыць такія абставіны, каб **добрым комсамольцам таварышы лічылі таго, хто добра жыве ў сваёй сям'і** (вядома на шэрагу з яго ўдзелам у грамадзкай працы).

Для выкананьня гэтых задач ячэйкам неабходна:

— Сыстэматычна (праз сходы ячэйкі, прыватныя гутаркі і г. д.) растлумачваць таварышом аб тым, як наладжваць добрыя ўзаемаадносіны з бацькамі, з малодшымі братамі і сёстрамі, чаму гэта неабходна і якая шкоднасьць ад дрэнных узаемаадносін.

— Правераць паводзіны комсамольцаў дома і тых, якія дрэнна жывуць з бацькамі, выклікаць на пасяджэньні бюро, дзе трэба ўсебакова. выявіць прычыны такіх зьявішчаў, прымаючы, у залежнасьці ад характару паступка, адпаведныя меры (выхаваўчыя і рэпрэсыўныя).

— Над комсамольцамі, якія ня выконваюць паказаньняў ячэйкі аб наладжаньні ўзаемаадносін з бацькамі, організоўваць грамадзка-політычныя суды, прыцягваючы на іх і дарослы... асабліва бацькоў комсамольцаў.

— Высьвятляць гэтае пытаньне ... ячэйковых вусных і насьценных га... зэтах.

Тут, вядома, трэба быць надзвычай... асьцярожнымі і да кожнага выпадку п... трэбен асобны падыход. Інакш мож... нарабіць шэраг памылак, якія акра... дрэннага нічога не дадуць.

Не аднолькава, таксама, трэба п... дыходзіць і да розных соцыяльных гру... комсамольцаў (рабочыя, сяляне, служачы... і інш.). Нашы трэбаваньні тут павінн... быць наступнымі:

— Комсамолец—сын рабочага, аль... селяніна, павінен дапамагаць сваім бацьк... кам. Калі-ж яны перашкаджаюць ям... ўдзельнічаць у грамадзкай працы, ка... яны яшчэ рэлігійны і г. д., па глебе ча... го могуць узьнікаць розныя непаразу... меньні,—комсамолец павінен гэта ўлічва... і з дня ў дзень, не сьпяшаючы, перавы... хоўваць іх. Грубасьці тут не дапусьцімы.

—Комсамолец—сын служачага, таксам... павінен добра жыць з бацькамі, але я... найгалоўнейшы абавязак--упартая ба... рацьба з той абывацельшчынай, мяшча... ствам, якія так глыбока сядзяць у быт... сям'і служачага.

— Комсамолец — выхадзец з сям... гандляра, папа і іншай «братии», паві... нен (калі ён гэтага не зрабіў да наступ... леньня ў Комсамол) парываць усяку... сувязь. Задачы перавыхаваньня тут н... можа быць.

* * *

Думку тав. Гаравога аб згуку пр... «Чырвонай Зьмене» нарады бацькоў ком... самольцаў я падтрымліваю.

ЯНКА.

АД РЭДАКЦЫІ. Зьмяшчаючы ар... тыкулы т. т. Гаравога і Янкі і н... выказваючы сваёй думкі па ім, рэ... дакцыя адчыняе па гэтым пытань... ням на старонках газэты дыскусію. Просьба да ўсіх комсамольцаў пры... сылаць матар'ялы з сваімі думкамі ... прапановамі.

СКУРАТАЎСКІЯ КОМСАМОЛЬЦЫ АСУШЫЛІ 21 ДЗЕСЯЦІНУ

„ЛЯГЧЭЙ РАСКАРЧАВАЦЬ БАЛОТЫ, ЧЫМ ПАПЕРЫ“.

Скуратаўцы—прыклад як трэба працаваць.

Яны замест слоў штодзённа робяць вялікую справу—заваёўваюць балоты.

(Вёска Скураты, Смалявіцкага раёну, Менскай акругі).

...Праз падкідваючую балотную гаць, на абапал якой блішчыць адвечная жоўта-цёмная вада багністых балот, праз нязграбныя. размытыя дарогі, ля аселіц бязьлічаных вёсак едзем у Скураты. Дождж імжыць і імжыць. І здаецца ня будзе канца яму... Толькі фурман перарывае яго, ускрыкваючы:

— Скураты блізка.

І бачыш, як высокай хваляй--гарой узмытай вузенькімі шнурамі--палёў уздымаюцца Скураты.

І калі хата Пятроўскіх, да якіх заўсёды накіроўваюць «шэфаў», была поўная народу, паліліся бясконцыя гутаркі, аб вайне, торфу, мэліорацыі, землеўпарадкаваньні...

Гордасьць скуратаўцаў, бязумоўна, балота.

У іміх надзеі і мары. Яны доўга апавядаюць як аграномы Менскага АКРЗА дзівіліся бачучы іх працу. Аб Скуратах ведаюць шмат дзе. Гэта адна з перадавых вёсак Менскай акругі.

Тав. Крупская і паўсотні вёрст балота

Узімку 1925 году Скураты былі зьдзіўлены. Чатыры комсамольцы арганізавалі ячэйку. І калі быў першы сход, зацікаўленых ячэйкай і яе працай, было шмат. Прышлі старыя і моладзь.

Гэта зацікаўленасьць сялянства і добрыя, сур'ёзныя адносіны, прымусілі комсамольцаў прызадумацца. Трэ' было ня ўдарыць у гразь тварам. Яны--комсамольцы--адразу узялі курс на гаспадарчую працу.

Доўга бегалі за дзесятак вёрст у райком за падмогай, але райком мала што мог дапамагчы. Трэ' было самім здабыць кніжкі, агронома. А адкуль? Нехта з сялян у жарт сказаў:

— Напішэце Крупскай.

Жартоўна кінутая думка не давала супакою. І нек' раз сход парашыў паслаць ліст да тав. **Крупскай**, прасілі кніжак.

Ліст ня прымусіў сябе чакаць і праз 2 тыдні прышла невялікая пасылка. Тав. Крупская прыслала 170 кніжак па ўсім пытаньням сельскай гаспадаркі, алоўкаў, сшыткаў і г. д.

І ў доўгія зімнія вечары, калі дзяўчаты цягнулі лён разам з цягучай, сумнай песьняй, 4 хлапцы, Пятроўскі Н., Чэкун П., Берастоўскі Н. і Карневіч П. заселі за кніжкі. Некалькі раз прачытвалі аб торфу, мэліорацыі, балотах і думкі сьвердзілі галаву.

Зьбіралі сходы, прачытвалі чытанае па 3 разы. Сяляне ня верылі, што іх адвечнае балота можа закрасаваць.

„...Глядзяць, ухмыляюцца“...

На прадвесьні, Менскае Акрза атрымала ліст ад скурацкіх комсамольцаў.

—Ці магчыма прыслаць агронома і выдзяліць вучастак?

Тое і другое прашоўшы «належныя інстанцыі» было зроблена.

У сярэдзіне мая прыехаў культтэхнік тав. Герасімава, чвэртку балота аддзялілі. прарылі каналы і праз дзьве нядзелі ўпартай працы яно было асушана.

Як пачалі рыць, прышлі сяляне, глядзяць, ухмыляюцца. А хлопцы да 120 см даганяюць глыбіню, па камені стоячы ў балоце. Хто пабагацей агітуюць бяднейшых, што нічога ня будзе. А бедныя ўсё-ж адчуваюць.--Праца. А працу трэба паважаць.

Толькі сварыліся, што нядзелямі працуюць. А потым, калі ўсё было асушана, нават ячэйцы рады давалі.

Новыя словы, новыя сказы.

Калі ўсё было зроблена, Скураты пачулі новыя словы, новыя сказы, адразу невядомыя, томас-шлак, фасфарыты і г.д. Аб іх гаварылі на кожным сходзе. Сыпаліся грозныя протэсты супроць АКРЗА, які ня слаў угнаеньня. Хадзілі ў раённы земаддзел, прасілі, трабавалі, Але... Але... —угнаеньня з Менску ня слалі. Кулакі падняліся:

— Вось бачыце, нават у Менску ведаюць, што гэтае балота нецатрэбная рэч.

Акрза нарэшце адмовіўся, што ўгнаеньне ён ня можа даць, затым, што даў аднаму селяніну з Скурат, які асушваў невялікі кавалак балота. Паказальны вучастак застаўся не засеяным. Беднякі ўсё-ж паверылі ў мэліорацыю. Вучастак быў сухі. Палова працы была зроблена.

І ў чэрвені перад сенакосам

бядняцтва ўзялося за рыдлёўкі.

Паслалі тэрмінова ў Менск ліст, каб прыслалі агранома. Акрза маўчаў, ня ехаў агроном, ня ехаў і культтэхнік. А чакаць было нельга.

Тады вышлі самі з дзецьмі і жонкамі на балота. Пайшлі рыць канавы бяз усялякага пляну, хто як хоча, каб толькі к рацэ сходзілі.

Неяк стыхійна вышла, кіраваць ня было магчымасьці, маса была ўзбударажана. Вынікі, праўда былі здавальняючыя, частка балота была асушана. Хлоп-



Дзе была балотаў твань, парасла трава.

цы ня спыняліся, бачучы такі ўздым агітаваць ня прыходзілася, склікалі сход, організавалі мэліорацыйнае таварыства, у яго ўвайшла амаль што ўся ячэйка. Адразу ўзялі крэдыт у Сельбанку на 350 рублёў.

І тады, калі канавы ўжо прарылі, прыехаў мэліоратар, пахадзіў, падзівіўся і паехаў. Далей працаваць перасталі. Настаў сенакос, жніво.

На ваенным становішчы.

Прышоў 1926 год. Для Скурат гэта быў год вайны, перамог і паражэньняў. Таварыства распадалася. Шлі спрэчкі. Асушваць балота зусім спынілі, прарыўшы яшчэ два каналы.

Справа была ў тым, што вёска ня мела добрага выгану, край болота замяняў выган, пасьцілі кароў, коняй і інш. Трава вельмі дрэнная, скаціну выганялі толькі, каб выганяць, карысьці яна ніякай ня мела. І на гэтым выгане--балоце дзьве дзесяціны былі кулака Тарана. Калі пачыналі асушваць, каналы павінны былі прайсьці праз яго поле. Згубіць дзьве дзесяціны, ды яшчэ каму, як ён кажа:

— Пад нос галыцьбе!

Тарану выган не хацелася губляць. Ён падняў яшчэ кулакоў. Супольна чэцьвера—галоўных, а за імі яшчэ некаторая цемнаватая частка беднаты. Вось і пачалі. Зьбяруцца сяляне ў сьвята, пасядуць, гутараць, балота, тое-сёе, а тут падойдуць.

— Ды што вы, скуратцы? Куды вы лезеце? Ня бачыце, што, ці вы асьлеплі, мы-ж выгану ня маем. Скацінка стаіць паміpae, выгнаць нельга.

Спачатку маўчыць бядняцтва, усё-ж ці за гэблем, ці за іншай рэччу трэба да іх ісьці. А хлопцы пачнуць: «Міхалоўскі мае 60 дзесяцін зямлі яна пустуе, пяць год абрэзаюць, усё такі абрэжуць, даб'емся свайго, вось будзе і выган».

— Дасьць цябе Міхалоўскі, чакай. Заплоціш 4 рублі, ці дасі жняю на лета, будзеш і пасьвіць.

Разгарацца беднякі чуць ня да калоў даходзіць. А такім чынам таварыства распадалася, далей капаць ня было як. Ячэйка рабіла ўсё магчымае, усе сілы, накоплены вопыт зьвярнула на тое, каб не загубілася таварыства. Дзе толькі сяляне не зьбяруцца, зараз хлопцы прыходзяць і аб балоце пачынаюць. Склікалі сход ячэйковы, запрасілі ўсё сялянства. Доўга дліўся сход, доўга палілася газьніца ў хаце Пятроўскіх. Парашылі выкінуць кулакоў і тых, хто іх падтрымлівае. Ня стала Вірылы, Чэкуна і інш., самых заядлых.

У таварыстве засталося 10 чалавек. Зноў перашкода, па мэліорацыйным законам 1926 году было гэтак, што калі ўся вёска ня можа перайсьці на мэліорацыю, асобная частка ня можа мець мэліорацыйнае таварыства.

І працу спынілі, чакалі, калі закон пераменіцца, аб гэтым ужо гаварылі.

Кулацтва падкладае „сьвіньню“

Калі гаварыць аб Скуратах, як аб вёсцы, дык трэба дадаць, што Скураты дзеляцца на дзьве паловы; паміма таго тэрыторыяльнага прызнаку існуючага ў кожнай вёсцы, на канцавых і сяродкавых, Скураты яшчэ дзеляцца і па клясаваму прынцыпу на «гару» і «ніз».

«Гара» і «ніз» дзьве баявыя пазіцыі з двума баявымі штабамі. На «гары» жыве бедняцкая частка. У «нізу»—кулакі і частка беднаты ідучая за імі.

Галоўнае поле падзей—балота. Не ўдалося пабурапеніць у таварыстве, кулакі зноў учынілі шкоду. З балота да вёскі дарога цягнецца. І як раскарчавалі балота, карчы пачаў кожны вазіць да дому. Кулак Бірыла ня можа глядзець супакойна, што ўсе карчы возяць, а ён не.

— Мяне з таварыства выключылі, а ля маёй зямлі возяць.

Узяў і заараў дарогу, пакінуўшы маленькую сьцежку прайсьці аднаму чалавеку, пасьля аўсом засеяў, як хто паедзе у суд падасьць. Поле топчуць. Хадзілі сяляне ў РВК. Там абяцалі...

„Калі чорныя, дык наш“

Каму з скуратаўцаў не паглядзіш на рукі, ува ўсіх яны чорныя, чорныя, глыбока ўеліся ў скуру кавалачкі торфу. Жартуюць часта:

— Каб адрозьніць сябра таварыства ад другога, глядзіце на рукі, калі чорные, дык наш.

І праўда, цяжкая праца пакінула моцныя сьляды. Не дарма-ж асушана 21 дзесяціны адвечнага старога балота. 15 дзесяцін ужо раскарчована. Асушка праводзілася чатырма каналамі, адзін з якіх магістральны сходзіў у рэчку. Зараз, як глянеш з «гары», балота адышло далёка, новае расчышчанае паблісквае каналамі—старое ў раскудлачаных бярозках здаецца ляском. Лясок—а прайсьці, дык завязьнеш.

Кожны дзень на балоце ад усходу да заходу ўсё таварыства з дзецьмі і старымі. Любата глядзець. У гразі ўсё, а песьні, жарты... Дзеці карчы цягаюць, дым вогнішчы.

Новае таварыства добра працуе, за гэты асушаны вучастак атрымалі прэмію 350 руб. На чале праўленьня моладзь—Берастоўскі І., Пятроўскі М. і інш.

Тысячагодзьдзі і тры гады.

Скурацкія балоты існуюць тысячагодзьдзі, але тысячагодзьдзі менш чым тры гады хаджэньняў і мук, чым тры гады хваляваньняў і перамог.

Што ні рабілі кулакі, а ніяк ня праймеш таварыства. Зараз выдумалі новую штуку.

Раніцой, калі выдзе таварыства на канавы і пачнуць капаць глыбей, да нормы, вада памаленьку назад ідзе. Станць па калені ў вадзе. Што гэта? Потым дагадаліся пабеглі да рэчкі. Глядзяць, млынар застаўкі пазастаўляў і сьмяецц

-- Ну, асушвайце, чаго-ж не працуеце? Лянавацца ня трэба!

Абурыліся скуратаўцы. Прасіць пачалі. А млынар пасьмейваецца. Сьцярпець не змаглі. Схапілі млынара, трымаюць, а астатнія застаўкі павыймалі. Вада паціху пачала спадаць.

Абяцалі і млын зьнясьці...

На кожным кроку вайна, самая сапраўдная вайна. Кожны крок балота каштуе здароўя.

Балота будзе засеяна,

--гэтак сказалі хлопцы. А колькі сіл будзе патрачана,--абяцалі і трактар прыслаць, чакаць яго немагчыма. Прыдзецца на сваіх худзенькіх коніках разорваць балота. А тут карчы трэба вазіць, торф з канаў...

Земаадзел і Менскі і раённы супакойны. Прыедуць і пахваляць...

Скуратаўцы ня спыняюцца на асушаных 21 дзесяцінах, яны кажуць, што хутка яшчэ столькі будуць разьмяраць і асушваць.

* * *

А весела на балоце. Гудзіць, стогне яно.

Трашчаць дрэвы, смогча гразь пад нагамі.

Густы і цяжкі надвігаецца вечар...

Змрок... Туман вільготны над балотам... А на ім кастры, кастры.

Вялікія... сьветла ад іх... А навакол—бадзерыя песьні...

Алесь Каліта.

„Н А-

рысы па гіс орыі Беларусі“—

яскрава малююць жыцьцё комсамолу Беларусі.

Як „мандат“ згубіў усю справу.

Паказальны вучастак, за які атрымалі прэмію, не даюць засяваць.

(Вёска Заказінец)

Калі ў Заказінец прывезьлі аўса, вікі, бульбы з Менскай балотнай станцыі, дзіву даліся заказінцы:

— Каб на балоце гэтакае вырасла. Не, мусіць, вас мужыкоў абдурылі,—ня можа гэтага быць.

Прышлі хлопцы, падумалі, патрымалі бульбу ў рукох, і захацелася самым гэткую мець. Пачалі грошы зьбіраць на кніжкі. Хутка сабралі, купілі. І ў доўгую зіму 1925 году заселі за іх.

Балота ля вёскі вялікае, імшыстае, не давала супакою

Усю зіму сядзелі вучыліся. Тэорыю добра ведалі.

І ў маі 1926 году прыехаў агроном. Разьмерыў паказальны вучастак. Прарылі тры каналы. Пабегла мутная чорнажоўтая вадзіца. Гразь на балоце спадала, тры нядзелі і чвэртка дзесяціны была гатова. Засталося заараць. Працавала ўсяго шэсьць маладых хлапцоў. Кожную нядзелю ішлі з рыдлёўкамі, упартыя, маўклівыя.

Зааралі асушанае, паехалі ў Смалявічы за ўгнаеньнем. Пахадзілі ад стала к сталу. Усё-ж такі даў агрaпункт штучнага ўгнаеньня. Падзялілі. балота на 7 частак і засеялі.

Кулацкія „цуды“

Кожны дзень хадзілі глядзець. Бачаць адзін раз, вытаптана частка поля. Каровы і коні прашлі. Залаваліся хлапцы:

— Хто-ж мог пусьціць. Сам скот ня пойдзе, бо нічога апрача голай зямлі няма.

Пачалі вартаваць. Да гэтага часу і сельска-гаспадарчы гурток організаваўся. Сябры гуртку, жыўшыя бліжэй да балота, пачалі начамі выходзіць глядзець.

Чвэртку балота вартавалі пільна. І адзін раз коняў Капшаеўскіх убачылі, прашлі па пасевам.

— Капшаі, вось хто...

Капшаі чатыры кулакі-хутаране, пачулі, што калі добра парасьце засеянае на паказальным вучастку, сяляне не пакінуць у супакоі балота, а пачнуць усё асушваць.

Вось і шкодзіць пачалі, травіць пасевы.

У адну з нядзель сабраліся ўсе на вучастку.

Кашулі новыя, хустачкі... з бліжэйшых вёсак амаль што ўсе, некаторыя папрыходзілі за 10-15 вёрст. Мітынг прашоў з уздымам.

Вынікі былі відавочны.

Віка парасла ў 130 сантымэтраў

акурат, як на Менскай балотнай станцыі, дзе прымяняюць усе навуковыя спосабы і магчымасьці. Бульба вялікая, якой ня бачылі сялянскія палеткі. Лён высокі, добры.

Тут-жа і заклалася мэліорацыйнае таварыства **„Новы шлях“**. Уступіла 15 чалавек. Сельска-гаспадарчы гурток пачаў яшчэ лепей працаваць, увашлі новыя дзяўчаты хлапцы.

Зьнялі пасевы, прадалі віку, купілі сячкарню. Зараз ёю карыстаецца уся вёска. Гурток узмацняецца, ён атрымоўвае 50—рублёвую прэмію за ўдалую асушку добрыя вынікі і працу сярод сялян.

Балота на восень заaралі, пабаранавалі... чакалі гэтай вясны, калі на абяцаных земаддзелам 15-ці дзесяцінах пачнуць капаць каналы.

Зімой сядзелі за кніжкамі. Кожную суботу сходы таварыства, сельгаспадарчага гуртку, кніжкі прачытваюць, ці хто небудзь гутарку вядзе.

Прышла вясна 1927 году.

-- Балота за таварыствам.

А кулакі Капшаі апэляцыю ў вышэйшы суд падаюць.

Вышэйшы суд хутка прысылае паперу назад. Перагледзець пытаньне з балотам.

РВК адклаў справу. Таварыства дзень і ноч у РВК, хутчэй прагледжвайце.

-- Час бяжыць. Сенакос на насу.

На канчатак РВК склікаў камісію. Прыехалі Капшаі, прышла амаль што ўся вёска. Таварыства тут. Пачаўся суд. Усё як належыць. Толькі заказінцы забылі хто ў камісіі, забылі што бюрократычнае кола прадаўжае круціцца... Вось і пытаюць:

-- Хто прадстаўнік таварыства вёскі Заказінец, такога-та сельсавету, раёну, акругі.

-- Мы тут усе... Вось усё таварыства.

-- Як гэта, а прадстаўнік ваш дзе?

-- Які прадстаўнік, мы ўсе разам прышлі...

Тады пашапталіся заказінцы і кажуць:

-- Вось прадстаўнік, выбралі...

І ўсё-ж суд адклалі і адклалі толькі таму, што на пытаньне «а ў цябе мандат ёсьць?» заказінскі прадстаўнік адказаў:

-- Няма!

І суд адклалі на невядомы тэрмін. Даўно атрымаў заказінскі прадстаўнік «мандат», даўно ходзяць сяляне ў РВК...

* * *

А балота старое, дзедаўскае стаіць... Раніцой туманамі акутанае... Хвойкі, бярозкі як попел шэрыя...

Нават **паказальны вучастак, за які атрымалі прэмію, засяваць не даюць. І топчуць яго капшаеўскія коні...**

Падойдуць сяляне да балота. Хоць кладзіся ды памірай, сваёй зямелькі мала, а тут тысячагодзьдзямі колькі прападае...

— Эх, зямліца!...

А РВК раіць пачакаць, абяцае ўсё даць. Сенакос на носу, праз тыдні два пачнецца.

Няма назвы гэткім падзеям, няма вызначэньня гэткім адносінам.

Чырвоназьменец.

Дапамога пацярпеўшым

Старшыня Саўнаркому БССР т. Галадзед зьвярнуўся з загадам да ўсіх акруговых выканаўчых камітэтаў, Белдзяржстраху, Наркамзему, Наркамату Ўнутраных Спраў і банкаў, у якім прапануецца гэтым органам рабіць неадкладныя ЗАХАДЫ ПА АКАЗАНЬНЮ ДАПАМОГІ НАСЕЛЬНІЦТВУ, ПАЦЯРПЕЎШАМУ АД НАВАЛЬНІЦ І ГРАДАБІЦЬЦЯ.

Для ўсебаковага падліку разьмераў страт пацярпеўшых, вызначэньня характару і разьмеру дапамогі. пры ўсіх акрвыканкомах утвараюцца спэцыяльныя камісіі ў складзе прадстаўнікоў АВК, земаддзелаў і ўправы дзяржстрахаваньня.

ЦК Беларускага Чырвонага Крыжу організаваў фонд дапамогі пацярпеўшым ад навальніц, асыгнаваўшы на гэта 1.000 руб.

ЦК зьвярнуўся з заклікам да Чырвоных Крыжоў СССР і паасобных рэспублік аб дапамозе пацярпеўшым.

Падрыхтуемся да 10-й гадавіны Кастрычніка

Прэзыдыум ЦСБСБ на сваім апошнім пасяджэньні абмеркаваў пытаньне аб падрыхтоўцы да 10-й гадавіны Кастрычнікавай Рэволюцыі ў профорганізацыях.

У прынятай пастанове прапануецца ўсім фабзаўмясцкомам і рабочым клюбам неадкладна вылучыць **„кастрычнікавыя камісіі“**, якія павінны зараз-жа заняцца падрыхтоўкай да сьвяткаваньня ў сваіх прадпрыемствах і ўстановах.

Згодна дырэктывы ЦСПСБ да ўдзелу ў сьвяткаваньні павінны быць прыцягнуты самыя шырокія масы працоўных, усе рабочыя, служачыя і іх утрыманцы

За некалькі месяцаў да сьвята клюб павінен распачаць падрыхтоўчую работу: арганізаваць вечары ўспамінаў удзельнікаў кастрычнікавых падзей, грамадзянскай вайны і падпольнага руху ў часе нямецкай і белапольскай окупацыі.

Прадпрыемствы рыхтуюць спэцыяльныя плякаты, у якіх павінны быць адбіты асобныя эпізоды кастрычнікавага перавароту на данай фабрыцы ці заводзе, у плякатах пажадана даць фотографіі ўдзельнікаў перавароту на даным прадпрыемстве і г. д.

Клюбным бібліотэкам трэба за 2 месяцы да сьвята падрыхтаваць адпаведную літаратуру аб Кастрычніку, якая павінна быць рэкомэндавана ўсім чытачом.

Спаборніцтвы модэляў-самалётаў

Саюз таварыства ТСААвіяхіму організуе ў бягучым годзе другія ўсесаюзныя **спаборніцтвы лятаючых модэляў, якія адбудуцца ў Маскве паміж 10—20 ліпеня г. г.**

Камітэт па організацыі і правядзеньню спаборніцтваў складзен пад старшынством тав. **Будзёнага,** намесьнікам старшыні вылучан намесьнік старшыні ЦБ ЮП тав. **Волкаў.**

Спаборніцтвы маюць на мэце падвесьці вынікі працы модэлістых СССР, прадаставіць модэлістым магчымасьць **абмяняцца вопытам і выявіць новыя ідэі ў пабудове модэляў лятаючых апаратаў.** Асаблівая ўвага на спаборніцтвах будзе зьвернута на фюзеляжныя модэлі **самалётаў, модэлі планэраў і паветраныя зьмеі.**

Асноўным патрабаваньнем для ўдзелу ва ўсесаюзных спаборніцтвах зьяўляецца ўстанаўленьне на мясц'х адлегласьці палёту модэляў **ня менш 100 мэтраў.**

Для модэляў апаратаў лягчэй паветры (дырыжаблі і інш.) ніякія абмежаваньні не ўстанаўліваюцца.

Модэлістым, выяжджаючым на спаборніцтвы неабходна мець на ўвазе, што праезд па чыгунцы і сутачныя на час **праезду і знаходжаньня ў Маскве (12 дзён) павінны быць аплачаны мясцовымі ТСААвіяхім.**

Акрамя прызоў за тэхнічныя дасягненьні модэлістых на другіх усесаюзных спаборніцтвах устанаўліваюцца прызы за грамадзка-тэхнічныя дасягненьні.

Комсамольцы у ВНУ

ЦК ЛКСМБ атрымаў 33 месцы ў ВНУ РСФСР і 12 месцаў у тэхнікумы УССР.

Жадаючыя паступіць у гэтыя навучальныя ўстановы павінны падаць аб гэтым заяву праз акругком ЛКСМБ у ЦК.

Месцы разьмяркоўваюцца ЦК на падставе рэкомэндацый акругкомаў ЛКСМБ, якія павінны быць накіраваны ў ЦК разам з заявамі і дакумантамі не пазьней 25-га чэрвеня.

Менск-Масква—шэсьць гадзін!

(На провадах удзельнікаў зоркавага пералёту)

Як і заўсёды, той-жа аэродром, тыя-ж маленькія домікі і тая вісячая ў паветры „каўбаса“..

З раніцы ў нядзелю аэродром рыхтаваўся праводзіць дарагіх гасьцей—віцебскіх лётчыкаў, удзельнікаў зоркавага пералёту Менск-Масква.

У пятніцу аэропляны прыбылі ў Менск з Віцебску. Прыляцелі дзьве машыны для пералёту і дзьве дапаможныя ў ліку якіх самалёт „тав. НЭТТЭ“.

У Маскву ляцяць „Р—1“ і „Фоккэр“.

Лётчыкі т. т. Нікітаў і Камароў, і іх лётнабы (памочнікі) Кандрацюк і Цьвяткоў. Яны маладыя авіятары, простыя вясёлыя хлапцы (ва ўзросьце ад 22 да 28 год) скончылі нашы савецкія лётныя школы.

11 гадзін. На аэродроме ўжо прадстаўнікі ТСААвіяхіму, дэлегацыі і так проста зяваючая публіка. Лётчыкі рыхтуюцца. Урачы праводзяць дасканальныя назіраньні, правяраюць дыханьне, важаць і г. д.

12 гадзін. Да атлёту яшчэ доўга.

Прадстаўнікі ТСААвіяхіму запячатваюць сургучом самапішучыя вымярыцельныя прыборы, паказваючыя вышыню-колькасьць пройдзеных вёрст і інш.

Апошнія рыхтаваньні.. Борт-мэханікі ўліваюць бэнзін.

— Матор ёсьць... Раз, два...

Маторы ў парадку. Машыны на старце. Засталося паўгадзіны. Мэнская і Маскоўская мэталюргічная станцыі перадаюць апошнія весткі, вецер спадарожны, хмарнасьць добрая. Лётнабы вылічваюць на прыборах, якую браць вышыню, тут-жа на траве, абкружаныя колам дзяцей, жанчын.

Вылятаюць у 1 гадзіну і 15 хвілін.. Яшчэ 15 хв. Назіраньні закончаны, вышыня вылічана. І крычыць Камароў свайму лётнабу:

— А ну, Цьвяточак, ляцім!

1 гадзіна 10 хвілін... Фотоздымкі... Мікітаў дае знак Камарову.

— Ляці першым!

Апошнія словы, лётчыкі з кабінак дзякуюць за провады, за цёплыя разьвітаньні.. Борт-мэханікі яшчэ раз ускакваюць у кабінкі.

Усё так проста!

І сьлізгвае пыл і зрывае шапкі, маторы ўрэзваюцца ў паветру.

Вышэй і вышэй. Хвіліна і іх няма, а 6-й гадзіне яны ў Маскве.

К.

497 кваліфікаваных майстраў

У гэтым годзе профтэхшколы металістаў па БССР выпусьцілі 272 чалавек, з якіх 144 сьлесары, 27 токараў па мэталю і 11 электроманцёраў.

Профшколы дрэваапрацовачнікаў выпусьцілі 156 чал. будаўнікоў—20, краўцоў—21.

Усяго профтэхшколы далі сёлета 497 кваліфікаваных майстраў.

Фабзавучы БССР выпусьцілі сёлета 16 паперкікаў, 10 тэкстыльшчыкаў, 16 гарбароў.

„У тыя дні“

Вышла з друку п'еса ў трох дзеях з пралогам: „У тыя дні“, Л. Каповіча (на яўрэйскай мове) Кошт 55 кап.

П'еса малюе гэроічную барацьбу комсамолу Беларусі ў часе белапольскай окупацыі

1300 ВЕРСТ ПА ВАДЗЕ

Жлобінскія комсамольцы ў дарозе

Цэлы дзень у хмызьняку на беразе—Плывем уночы.—Вітаемся з Кіевам.

9-е чэрвеня, мястэчка Камарын, 273 вярсты ад Жлобіну

Адважыцца ехаць сёньня—значыць ісьці з упэўненасьцю на тое, каб вецер пахаваў нас у хвалях Дняпра.

Прышлося гэты дзень правесьці ў хмызьняку ля берагу. Праўда, хоць настрой ад гэтага і быў дрэнны, але ўсё-ж такі хлопцы духам ня падалі, добра падмацаваліся і выспаліся. Пад вечар, як толькі прыціх вецер паплылі далей.

Па дарозе заехалі ў мястэчка Любеч за продуктамі. Тут-жа мы ў першы раз пачулі гутарку на ўкраінскай мове.

Ноч. Дняпро спакойны. Сустракаюцца сыгнальныя ліхтары, паказваючыя шлях суднам, а разам і нашым „пасажырскім караблям“.

За гэтую ноч праехалі яшчэ 55 вёрст. З узыходам сонца мы ўжо каля мястэчка Камарына рыхтуем сьнеданьне і робім адпачынак на 3 гадзіны.

10-е чэрвеня, вёска Ашыткі, 350 вёрст ад Жлобіну.

Меркаваньні за 4-5 дзён даехаць да Кіева парушаны. Прырода сваімі пасланцамі—ветрам і дажджом—перашкаджала нашаму вандраваньню. У дзень ехаць і сёньня вельмі цяжка—лодкі ледзь рухаюцца. Мы рашылі ехаць уначы.

Якая працівалегласьць паміж днём і ноччу. Уночы цепла, вецер не скалыхнецца, яшчэ цішэй, чым учора.

А Дняпро?!

Не, гэта ня той злуючы Дняпро, ён быццам адпачывае ад вялікай дзённай працы,—бурнага дню.

Нейкая асалода ахоплівае цябе, гледзячы на гэтую чароўнасьць. А навокал ціха. За гэты пяты дзень нашага плаваньня мы зрабілі яшчэ 77 вёрст, дасягнуўшы вёскі Ашыткі.

11-е чэрвеня, у кастра, 9 верст ад Кіева і 429 вёрст ад Жлобіну

Сеньня мы праехалі 79 вёрст. Гэты дзень нічым ня розьніцца ад ранейшых: тая-ж вялікая шырыня, Дняпра і той-жа дождж. Розьніцца наш цяперашні шлях толькі тым, што едучы па тэрыторыі УССР мы ўжо зусім ня сустракаем лясоў, вось ужо даўно ня бачылі бярозу, усюды вярба, лаза.

Не даяжджаючы Кіева нас сустрэў прыгожы малюнак: у версе над ракою на кручы ўсё ў зеляніне—сяло Старасельле і Вышгарад, паміж якіх стаіць былы манастыр. Унізе, ля Дняпра 7 вялізарных труб ад цагельных заводаў. Мы з захапленьнем глядзелі на гэтую прыгожасьць, Доўгі час ня можна было адарваць вачэй ад гэтага месца. Адзін з турыстых гледзячы на гэты малюнак сказаў: „Што-б я быў за дурань, каб не паехаў на экскурсію—гэта-ж памятка на ўсё жыцьцё“.

А заўтра раніцою мы будзем ў Кіеве.

Цяпер-жа у кастра мы сачым толькі за шматлікімі ліхтарамі асьвятляючымі горад і вабячымі нас да сябе.

Вадзім Зязюля.

І СЯРОД САНДАЛЯЎ...КЛЯСАВАЯ БАРАЦЬБА

Хіба-ж вы знойдзеце больш няві́ныя рэчы, чым сандалі?..

Здавалася-б што не. Беспартыйныя ад натуры, аполітычна настроеныя, у варштатах шорнікі з імі ня вывучаюць Марксаву тэорыю клясавай барацьбы.



Усходзіны на Монблян

І ўсё-ж такі... І ўсё-ж такі нячасьце ўлезла і ў іх спакойнае жыцьцё. І ў выніку два ціханькіх сандалі сілком уцягнуты ўвар'яцкі вадаварот клясавай барацьбы.

—?...

Рабочы Менскай бойні купіў сабе пару сандаляў у адным з магазынаў МЦРК. Перарыўшы ўсе сандалі, якія знаходзіліся ў магазыне, ён урэшце выбраў сабе лепшыя з „найлепшых“. Два „животрепещущих“ сандалі на дзьве жывыя ногі і з аднэй меркай—адзін правы—другі левы. Хіба-ж трэба лепшае?

Але потым выявілася, што абодва сандалі належаць да двух розных варожых клясаў.

Правы сандаль аказаўся арыстакратам: нежным, лёгкім, з тонкай, добрай скуры. Левы —наадварот: пролетарскі, нязграбны цяжкі, з дрэнна выпрацаванай скуры—проста калека. І дасталося-ж ад гэтых сандаляў рабочаму. Яны вечна пакою яму не давалі... Замучылі бедака.

— Чаму-ж ты яго цягнеш гэтага арыстакрата, паразіта, шкоднага элемэнта?—прыставаў сандаль—„пролетарыят“.

— Чудак чалавек на які чорт табе гэта брудная істота? Ці мала табе такой „падлы“ ў бойні?—з гонарам адказваў сандаль“—арыстакрат“.

Адным словам рабочы быў заблытаны, ён ня ведаў каго слухаць, а панірыць дзьве варожыя клясы, справа ня зусім лёгкая. К таму-ж трэба сказаць, што гэты рабочы ня быў апортуністым, ён—сябра профсаюзу харчаўнікоў, які стаіць на плятформе клясавай барацьбы.

— Коратка кажучы рабочы з кожным днём таяў як сьвечка. А МЦРК у яго асобе нажыў сабе ярага ворага да самай сьмерці.

— Ён-жа вінаўны ў маім горы—думаў ён пра сябе мацаўшы і ашчупваючы сандалі, як шанічныя пляцёнкі. Калі „арыстакрат“, дык хай-бы ўжо абодвы былі-б „арыстакратамі“, ці „пролетарыят“, дык хай-бы ўжо абодвы.. На вошта гэта патрэбна была МЦРК зрабіць такую „клясавую дыфэрэнцыяцыю“ паміж імі?..

І аднойчы, калі сандалі ўлезьлі яму ў „селязёнкі“, „пячонкі“... і рабочыя бойні к таму-ж яшчэ падзадорвалі яго, гледзячы на яго сьмешныя ногі, ён больш вытрымаць ня мог, несьцярпеў: пабег да загадчыка магазыну выліць на яго голаву ўсё сваё гора. У краме рабочы сьцягнуў сандалі з сваіх ног і тыкаў сандалі яму проста ў твар:

— Сорамна павінна вам быць і вашай коопэрацыі—крычаў ён размахваючы сандалямі і брызгаючы сьлінаю на ўсю краму.—Так вы змагаецеся за якасьць? З такімі сандалямі вы да соцыялізму ніколі не даедзеце, у дарозе не застанецеся і назад ня вернецеся.

Ян. Рубенчык.



СЕЛЯНІН (ЦЭНАМ): Ну, таварышы, на сваіх хадулях вы тутака ня пройдзеце. Крыху спусьціцца прыдзецца...

Прыймовы пакой ЦВК

Дзеля прыёму грамадзян, якія зьвяртаюцца ў ЦВК з рознымі заявамі і скаргамі, організаваны спэцыяльны прыймовы пакой (Пляц Волі, № 4).

Наведвальнікі будуць прымацца як старшынёю ЦВК так і паасобнымі членамі прэзыдыуму ЦВК штодзённа, акрамя субот і нядзель.

Менск-Каўказ

Турызм з кожным днём заваёўвае ўсё большыя і большыя шэрагі прыхільнікаў.

На гэтых днёх 6 чалавек студэнтаў БДУ накіроўваюцца з Менску у падарожжу па маршруту Менск-Каўказ.

Едуць яны цягнікам ад Менску да Бабруйску там перасеўшы на 3-х парную шлюбку паедуць па Беразіне, далей па хвалях бурнага Дняпру, да пабярэжжа Чорнага мора.

Тады пехатой, абагнуць Крымскі паўвостраў перасякуць Керчанскі праліў і ізноў па паўднёваму берагу Каўказа да Туапсэ пехатой. Усе 6 турыстых актыўныя комсамольскія працаўнікі.

— Пачатая па ініцыятыве комсамольскай ячэйкі БДУ, падрыхтоўчая праца па экскурсіі падтрыманая рознымі організацыямі (ЦК ЛКСМБ, ТСААвіяхіму і г. д.)—дала магчымасьць турыстам сабраць належныя сродкі каб выехаць у падарожжа.

Праўленьне БДУ адпусьціла турыстым 150 рублёў, прафком пэдфаку 70 рублёў, Выканбюро—20 рублёў і яшчэ грошы са стыпендый.

Экскурсія разьлічана на 2 месяцы. Экскурсанты ставяць сваей мэтай, апрача заданьняў фізкультуры, таксама азнаямленьне, з працай тых комсамольскіх організацый міма якіх будуць праяжджаць.

Таксама азнаёміцца з жыцьцём Украіны, яе навучальных устаноў і іншых організацый.

Турысты ўпэўнены ў добрым ісходзе падарожжа.

Чычэ.

У ТРЫ РАДКІ

○ **Белсельбанк адпусьціў Асінастрою 100 тысяч рублёў** на разьвіцьцё будаўнічых работ.

○ **Усебеларускую кніжную лётарэю на карысьць падшэфных вёсак** наладжвае Менскае акруговае шэфтаварыства.

○ **ЦК МОПР'у Беларусі** зноў пераводзіць на карысьць політвязьняў у Заходняй Беларусі **40 тысяч рублёў.**

○ **Усебеларускія курсы ізбачоў** пачынаюць працаваць 1-га ліпеня г. г.

○ **Наркамзем БССР** высылае ў акругі 17 спэцыяльных экспэдыцый дзеля барацьбы са шкоднікамі палёў.

○ **Беларускі Дзяржаўны Вандроўны Тэатр** Галубка за апошнія два месяцы паставіў **44 спэктаклі,** на якіх перабывала **звыш 20 тысяч сялян гледачоў.**

○ **Менская аб'яднаная профтэхшкола** мэталістаў і дрэваапрацовачнікаў выпусьціла **42 чалавекі, кваліфікаваных майстраў.**

○ **На сэзонных работах у БССР** сёлета занята каля 60 тыс. чалавек.

○ **30** чалавек будуць сёлета прыняты на **мэдычны факультэт БДУ.**

○ 18-га чэрвеня ў Менск прыехаў галоўны інжынэр Асінастрою тав. Алейнікаў, які зрабіў справаздачу перад прэзыдыумам ВСНГ аб ходзе работ на Асінастрої.

Тав Алейнікаў учора паехаў назад на Асінастрой.

Адказы чытачам

Трацякову (977). Кожны селянін мае права быць сябрам коопэрацыі.

Яму-ж (978). Для паступленьня ў школу сялянскай моладзі патрэбны веды чатырохгодкі. Прыём адбываецца шляхам падачы заявы ў мясцовую школу.

Махноўскай (979). Пры пераездзе ў другі раён, трэба пры паступленьні ў партыю мець рэкомэндацыю той комсамольскай ячэйкі, да якой ты прымацавана, ня гледзячы на тое што раней ужо была рэкомэндавана.

А. Малочніку (980). У Менску ёсьць Архітэктурна-Дарожна-Будаўнічы тэхнікум. Калі маеш водгук пэдсавету сямігодкі, дык іспыты трымаць табе не патрэбна. Заяву дасылай па адрасу: Менск, вуліца Карла Маркса, Архітэктурна - Дарожна-Будаўнічаму тэхнікуму.

Крывое люстра

Пяцігадовая цяганіна.

Аб пакрыўджанай удаве і магутным сьвёкры.

Цягнецца гэтая справа аж з самага студзеня месяцу 1923 году і канца няма ёй праклятай аж дагэтуль.

У 1923 годзе аўдавела сялянка Матрона Радзькова. Не пасьпела мужа пахаваць—новае гора,—крыўда ад сьвёкра. Апошні сілком усяліўся у яе хату, самавольна захапіў яе зямлю і давай гнаць старую з наседжанага кута.

Старая паскардзілася ў зямельную камісію Лупалаўскага раёну, (Магілеўшчына) якая хутка вырашыла справу, папрасіла гвалтоўніка-сьвёкра вон з Матрэнінай зямлі і выдала ёй спаўніцельны ліст.

Як „выканалі“ спаўніцельны ліст.

Абрадавалася старая. Думае,—раз пастанавіла земкамісія, выдала спаўніцельны ліст, значыць кончаны пакуты. Выбірэцца нарэшце гвалтаўнік з незаконна захопленай ім зямлі.

Але ня тут-то было. Хутка пастанова выносіцца, але ня хутка яна выконваецца, тым больш, калі сьвёкар заможны і можа каму належыць «усунуць у рукі».

Карацей кажучы мясцовая ўлада,—сельсавет і міліцыя ня прымалі ніякіх мер да выкананьня спаўніцельнага лісту, і сьвекар па ранейшаму заставаўся сядзець на неналежачай яму зямлі.

Камісіі пастанаўляюць.

Бачучы, што ліст ня выконваецца прышлося пакрыўджанай Радзьковай зноў падаваць скаргу ў райземкамісію. Гэта было ў 1925 годзе.

Камісія, разглядзеўшы справу, у другі раз выносіць пастанову аб выжыцьці гвалтаўніка і прыцягненьні яго да адказнасьці за незаконны захоп зямлі.

Баючыся, што на гэты раз пастанова камісіі можа быць сапраўды выканана, задумаў сьвёкар як-небудзь адцягнуць яе выкананьне. Падаў касацыю, спачатку ў акруговую земкамісію, а потым у вышэйшую катэгію па спрэчных зямельных справах.

Але і тут і там адмовілі. Здаецца, што калі на баку пакрыўджанай ўдавы стаіць уся ўлада як мясцовая, гэтак і цэнтральная, значыць канец справе. Але не яшчэ!

Мала радасьці ўдаве, што ўлада на яе боку, калі зямлёй па-ранейшаму карыстаецца сьвёкар.

А справа ні з месца.

Што вы скажаце, калі даведаецеся, што цяпер, праз 5 гадоў пасьля пастановы райземкамісіі, пасьля зацьверджаньня і перазацьверджаньня гэтай пастановы адпаведнымі вышэйшымі інстанцыямі, справа яшчэ ня кончана. Пайшла пісаніна паміж рай і акрземкамісіямі, АВК, РВК пракурорам ды іншымі установамі... І ідзе аж да гэтага часу.

Нарэшце атрымаўшы рашучы загад з цэнтру, старшыня райвыканкому зразумеў, што жарты дрэнныя. Трэба нешта прадпрыняць. Паслаў ён ня менш рашучы загад старшыні сельсавету, і на гэтым супакоіўся.

Старшыня с-с. доўга чухаў патыліцу, лаяў райвыканком, удаву і ўсіх на сьвеце. Не хацелася яму псаваць адносін з «магутным сьвёкрам», але нічога ня зробіш, бо вышэйшая ўлада загадвае.

Нарэшце вось як «выканалі» спаўніцельны ліст. Прыехала міліцыя і пачала ўсяляць Матрону ў яе хату. Але міліцыя ўсяляе, а сьвёкар выкідае. Гэтак было шмат разоў. Абрыдзела гэта справа міліцыі так, што яна паехала і больш не зварачалася. «Магутны» сьвёкар застаўся сядзець. Гэтак было «выканана» судовае рашэньне.

Я. З.

Згублены:

○ Часовае пасьведчаньне на імя **Каждан,** выдадзенае **Менакругкомам** ЛКСМБ.

○ Сяброўскі білет № 53075, выдадзены **Менакругкомам** ЛКСМБ на імя т. **Шварца С.**

○ Часовае пасьведчаньне № 576, на імя **Шумскага Сьцяпана,** выдадзенае Слуцкім Акругкомам ЛКСМБ.

○ Кандыдацкая картачка № 479 на імя Яцына.—Лічыць страціўшымі моц.

Апавяшчэньні Клюбу „КІМ“

З прычыны рамонту клюбу і пераўчоту кніг, з 15-га чэрвеня па 15-е ліпеня бібліотэка клюбу „КІМ“ будзе зачынена.

Прапануецца ўсім чытачам зьвярнуць узятыя кнігі. Прыём апошніх адбываецца з 8 да 10 гадзін вечара.

Праўленьне клюбу „КІМ“

Адказныя рэдактары { А. БАРАНЬНІКАЎ. А. КУРЦІК.

Галоўлітбел № 24867 Менск, 2 друкарня БДВ.